# ПИНСК В СОВРЕМЕННОЙ БЕЛАРУСИ

**Тезисы докладов**
**научно-практической конференции**
**молодых ученых Пинщины**

**Пинск, 21 мая 2004 года**

ПИНСК, 2004

Рецензенты:

Нефагина Г.Л. – д. ф. н., профессор
Голубев С.Г. – д. э. н., профессор

**Пинск в современной Беларуси: тезисы докладов научно-практической конференции молодых ученых Пинщины, Пинск, 21 мая 2004г.**

***Е.А. Игнатюк***
поэтесса, кандидат филологических наук
УО «Пинский государственный высший банковский колледж
Национального банка Республики Беларусь»
г. Пинск

## ЛІРЫЧНАЕ ПРАЧЫТАННЕ ТЭМЫ «ПАЛЕССЕ» Ў ТВОРАХ МАСТАКОЎ ДРАГІЧЫНШЧЫНЫ

Драгічынскае Палессе – край мастакоў (паэтаў, жывапісцаў), якія бачаць сваю «палескую глыбінку» - у яе духоўна-культурным развіцці – маленькай цывілізацыяй. ...Цывілізацыяй з адноўленай этнакультурай Брэстчыны, з водгалассем антычнай культуры на Палессі, з паляшучкай Флорай – як у творах Уладзіміра Кожуха, папулярызатара вобраза «сялянкі-флоры» ў беларускім выяўленчым мастацтве (мастак нарадзіўся у Драгічыне); цывілізацыя гэтая - з храмамі ды з лазурытавымі хрысціянскімі крыжамі – нібыта ад Лазара Богшы – ювеліра, які

змайстраваў крыж Еўфрасінні Полацкай. ...Драгічыншчына – і з нейкім «вэлюмавым» святлом прыроды – як у імпрэсіяністычных пейзажах П Мыслывца, дзе кветкі Палесся – вяргіні, званочкі, валошкі, дзьмухаўцы – лубочна-дывановыя, быццам дэкаратыўна тканыя...

Творы мастакоў Драгічыншыны можна пракаментаваць лірычна-вершавана.

Драгічынцы па праву ганарацца сваім таленавітым земляком Мікалаем Кузьмічом (у 1982г. ён закончыў Мінскае мастацкае вучылішча імя Глебава). Пяць гадоў ювелір з Вулькі Антопальскай працаваў над узнаўленнем згубленага ў час 2-ой Сусветнай вайны Крыжа Еўфрасінні Полацкай, узнавіў тэхніку перагародчатай эмалі XII ст. Мастак працаваў з каштоўнымі металамі: з тытанам, з бронзай, з мельхіёрам, але яго «выбранніца» - эмаль. М.Кузьміч – аўтар эмалевых партрэтаў выдатных дзеячоў беларускай гісторыі: Усяслава Чарадзея і Чарадзеявай унучкі Прадславы-Еўфрасінні. Я ж хачу весці размову з ювелірам пра сэнс ягонай творчасці ўмоўна-вершавана. Напрыклад так:

Ювелір з палескай Вулькі...
(Мая ж "хатка" ў Караліне.)
Ты – як вецер моцны, гулкі –
шлеш мне сон ад Еўфрасінні:
Бо крыжы – мне сняцца-сняцца...
Як на могілках... Ці ў храме?
Больш не трэба хвалявацца,
што я ў нечай "піктаграме".
Сню я крыж,
што Лазар Богша*
змайстраваў для Еўфрасінні...
Я ў стагоддзі Богшы... Божа...
Як з каронай. Белай... Сіняй...

У Драгічынскай зямлі шмат абліччаў, інтанацый. Так, у *Чарнобыльскім цыкле* Уладзіміра Кожуха (сябра Саюза мастакоў Беларусі) Драгічыншчына - то знямела-містычная, "амаль эльгрэкаўская" ( як

* Полацкі ювелір Богша, які меў і хрэсціянскае імя – Лазар, стварыў свой шэдэўр на заказ Еўфрасінні ў 1161 годзе. Такую надзвычай адказную працу майстар мусіў рабіць з благаславення і пад наглядам ігуменні Спасаўскага манастыра. Сама Еўфрасіння, верагодна, была аўтаркаю эскіза святыні і пакінута на ёй вялікага надпісу.

Крыж Богшы мае шэсць канцоў-промняў. Шасціканцовая форма крыжа сімвалізавала створаны Богам за шэсць дзён свет. Сучасныя багасловы лічаць, што "якраз у такой форме ўвасоблены самы дасканалы сімвал першабытнага Сусвету. Ён адначасова сімвалізуе як пашырэнне Божае сілы, так і працэс вятранні свету да свайго духоўнага цэнтру".

характарызуе "Палессе" У. Кожуха пісьменніца Г. Багданава), то *святая, светлая – як у раі...*

У кампазіцыі "Вячаравы звон" людзі нібы скамянелі: яны ў палоне містычнай пустэльнай прасторы – нерухомай... Не можна нават пачуць, па кім звоняць званы...

...Але ў асноўным – у творчасці У.Кожуха пераважаюць легкасць, артыстычнасць, жыццярадаснасць. «...Гэта гульня фантазіі і свята фарбаў. Летуценнасць і сузіральная сканцэнтраванасць, што інтрыгуе недагаворанасцью, пранізвае ўсю творчасць мастака» - так ацаніў жывапіс У.Кожуха кандыдат мастацтвазнаўства М.Баразна. У пейзажах на тэму прыгажосці жыцця ("Спевы вясны", "Снеданне на траве" і інш.) У.Кожух заве гледача напіцца духоўнай нацыянальнай расы, кліча адшукваць у палескіх лугах - па вясне - паненку Флору. Мастак інтэрпрэтуе сялянку з Палесся як антычную багіню Вясны. Можна ўяўна прайсці па сцежках-лугавінах ад Драгічына аж да самага Днепра –Бугскага канала – разам з вобразнай сялянкай – Флорай, ды з маёй (прыдуманай ў вершы) фіялетавай танцоркай:

Фіялетавая флора...
Толькі ўчора,
толькі ўчора
на прагулку выйшла ў сад:
фіялетавая ружа
і ружовая прастора:
блікі сонца ў кроне клёна,
нібы ў пацерках агат...
Так букетна... Танец з ветрам...
Пачала паненка Флора...
Ружавелі кабарэтна
яе вусны... Толькі ўчора...
Сон-травой цвіце спадніца.
Танец з ветрам – не спыніцца...
Вецер – франт...
Як містык Бёклін...
А яго каханка – Флора...
Танцавалі – нібы моклі
пад дажджом цюльпаны ўчора...

Сапраўды, калі паназіраць, дажджы Драгічыншчыны – асабліва ў маі і ў чэрвені – над Днепра-Бугскім каналам – быццам расквечаны ружова-фіялетавымі цюльпанамі і нават пахнуць, як цюльпаны... І ў такія моманты твораццa мною *лірычныя абразкі:*

"Стаю на беразе канала... Поўдзень. Пад нагамі пясок – бліскуча-белы – як цукар, рассыпаецца... А з другога берага даносяцца галасы малінаўскіх дзяўчат, якія глядзяцца здаля лілеямі – у белых спадніцах, пы лёсткава разгорнутых, развеяных ветрам... Дзяўчаты толькі што здал школьныя экзамены і атрымалі «атэстат» аб сярэдняй адукацыі... Прыйшл пакланіцца Днепра-Бугскаму каналу за ягоныя ўрокі...

Ветлівы паромшчык – жывапісны – з тварам «этнічнага яцвяга» - зда ецца, трымае сонца за плячыма... Ён перавозіць з малінаўскага берага на другі – белінскі - пажылога, дужага з выгляду палешука. А побач з «дзяд ком» - конік, ды сабраныя ў «хуру» на вазку травы чэрвеня. «Хура» сена - нібы намалявалася сонцам. Як на карцінах Клода Манэ. Як вядома, Клод Манэ стварыў серыю з пятнаццаці карцін, дзе адлюстраваны стажкі сена ў розныя моманты дня.

Слухаю музыку шлюза. Вада шуміць, цячэ-тчэцца... Нібы на ткацкім станку, ткуцца «дываны» вады – у праменных лініях вадаспаду – ажурныя – як карункі на спадніцы якой-небудзь паненкі."

Адзначым яшчэ: каларыт нацыянальнага духу палешука найбольш высвечваецца праз *песню.*

Што для Вас песня? – пытаюся ў адной гаспадынькі, якая любіць спяваць палескія песні. Чую адказ: "Песня – адзіная выратавальная і стваральная сіла, песня не разбурае... Вось... успамінаю сваю 95-гадовую маці: вельмі хворая, але ж у маёвым садку спявае... Людзі слухаюць і кажуць: гэтак яна боль перакрывае. Песня – крык душы... Мая песня колеру небёсаў... Пахне верасам, ляснымі зёлкамі".

А вось драгічанскі пейзажіст-імпрэсіяніст П.Мыслывец песню асацыруе з пахамі і колерамі «стажкоў сена» - мастак любіць маляваць стажкі – як «вялікодные яйкі», як «блінцы»...

У связі з гэткай прыроднай песеннасцю палешукоў хочацца прыгадаць легенду «Пра Днепра-Бугскі канал і дзяўчыну-песню», якую я запісала мінулым летам у вёсцы Малінаўка.

"Калісь, яшчэ ў дахрысціянскія часы, жыла на тэрыторыі этнічнага Палесся, на Драгічыншчыне, дзяўчына – Вада. Яна была такая прыгожая, што яе пакахалі два князя – сінявокі Дняпро, і зяленавокі Буг. Але дзяўчыне падабаўся таленавіты Лесь – пясняр, паэт, вандроўнік, які хадзіў па Палессі, збіраў "песні", і дарыў свой талент усім, каго сустракаў на сваім шляху. Песні былі настолькі прыгожыя, гучныя, што хутка рэхам разносіліся па ўсім палескім краі. Пачула Лесяву "песню" і Вада. Адразу закахалася ў хлопца і яго песні. Яна памятавала кожную з іх і назбірала іх столькі ў сваей душы, што калі Лесь пакінуў Палессе, Вада пайшла следам за яго песнямі, каб пераўтварыцца ў дзяўчыну-песню – вечную песню Палесся .

Людзі кажуць, - калі Матэвуш Бутрымовіч задумаў будаваць Днепра-Бугскі канал, то ён напачатку выклікаў дух Вады... Хацеў , каб дзяўчына-песня блаславіла людзей на працу...

Песня з'явілася – як зязюліна "ку-ку", ці як шмялёвае "жу-жу".

Вось чаму вада ў канале такая цёплая, меладычная, радасная".

## СОДЕРЖАНИЕ

Секция 1. **ЭКОНОМИКА ПИНСКА: СОСТОЯНИЕ И ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ** ........................................3

*М.Н. Серков* Состояние и перспективы развития экономики г. Пинска .......3

*С.В. Галковский* Развитие экономики Пинска и Пинского района в послевоенный период........................................................................................6

*А.С. Голубев, В.А. Шинкаревич* Социально-экономический ущерб Беларуси и г. Пинска за годы великой отечественной войны.......................................10

*И.В. Гориш* Проблемы социально-экономической трансформации в малых и средних городах Беларуси........................................................................13

*Д.Л. Завадская* Естественная монополия в инфраструктуре города............16

*Е.С. Жук* К вопросу оценки эффективности международных денежных переводов частных лиц в г. Пинске..............................................................18

*С.А. Клещева* Оценка инвестиционной привлекательности промышленности города Пинска..................................................................23

*Д.А. Лукашевич* Необходимость развития инвестиционной деятельности на примере Брестской области ..........................................................................27

*Л.Н. Черноокая* ЗАО «Пинскдрев» - лидер деревообрабатывающей и мебельной отрасли Республики Беларусь ....................................................30

*Г.А. Щерба* Экология человека в условиях хозяйствования и новой оценки земель сельскохозяйственных угодий товаропроизводителей.....................33

*Г.Ф. Вечорко* Развитие системы экономического образования в Пинске.....38

*А.В. Белоусов* Необходимость и проблемы развития экономического образования в системе среднего образования г. Пинска...............................41

Секция 2. **ИСТОРИЯ И КУЛЬТУРА: ОСНОВНЫЕ НАПРАВЛЕНИЯ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЯ**..................45

*В.Г. Гришко* Историко-географическая характеристика Пинщины на современном этапе...............................................................................................45

*М.В. Цуба* Піншчына падчас Першай сусветнай вайны ................................49

*А.Л. Ильин* Роль пинчанина Эдмунда Зуземиля в белорусском национальном движении........................................................52

*И.Э. Еленская* «Пінська газета». 1942-1944 гг. ..........................................54

*В.Л. Блищ* Историко-культурное наследие сел: сохранение и развитие исторические села Ивановского района Брестской области......................60

*Е.Л. Жежейко* Становление и развитие самобытных традиций на Пинщине .......................................................................................66

*С.А. Жук* Белорусское барокко в архитектуре г. Пинска............................69

*Е.А. Игнатюк* Лірычнае прачытанне тэмы «Палессе» ў творах мастакоў Драгічыншчыны...........................................................................71

Секция 3. **ВОСПИТАНИЕ, ПСИХОЛОГИЯ, ДУХОВНОСТЬ. ПРОБЛЕМЫ СТАНОВЛЕНИЯ ПРАВОВОГО И ЭКОЛОГИЧЕСКОГО СОЗНАНИЯ** .........................................76

*Л.Н. Давыдова* Воспитание психологической культуры личности – одна из основ воспитания нравственности.................................................76

*Г.В. Ивчик* Новая социальная ситуация и актуальные проблемы воспитания молодёжи ...................................................................................79

*В.В. Василевицкий* Особенности уровня субъективного контроля членов деструктивных религиозных объединений в городе Пинске.......................83

*Л.Н. Савич* Проблема деструктивного влияния тоталитарных культов на молодежь и пути ее преодоления ...................................................86

*Е.В. Ярошук* Состояние и пути совершенствования идеологической работы в общеобразовательной школе.........................................................88

*Е.Л. Касьяник* Развитие профессиональных представлений адептов в процессе обучения профессии........................................................91

*Н.М. Горбач* Проблема гендерного воспитания детей, проживающих в детских домах и школах-интернатах..................................................94

*А.А. Головин* К творческой трудовой деятельности учащихся, через внеурочные формы работы............................................................96

*В.Г. Гришко* Методика преподавания курса «Валеология» в гимназии № 2 г. Пинска ...........................................................................103

*А.Я. Веренич* Умение решать производственные задачи – как одно из условий воспитания активной жизненной позиции будущего специалиста........................................................................................106

*Т.Н. Евчик* Компьютерное тестирование как одна из компонент современного образования ........................................................................108

*Т.Г. Кейта-Станкевич* Проблемы и перспективы защиты прав потребителей в аспекте судебной практики верховного суда Республики Беларусь (опыт суда Пинского района и города Пинска) ...........................110

*П.А. Павлов* Проблемы безопасности в электронном бизнесе.....................114